ШЫКОЎНЫ АБРУС З ДЗІВІНА

Як нашы майстрыхі спалучаюць нямецкую якасць з беларускім каларытам

Рабочы цэх.

Калі б гадоў дваццаць таму хто сказаў, што ў Дзівіне будуць выраблаць камплекты сталовай і пасцельнай бялізны для найбуйнейшых гатэляў, авія- і чыгуначных кампаній свету, а таксама выконваць заказы для VIP-персон з каралеўскіх сямействаў, гэта прагучала б ва ўнісон назве... дзіўна. Названае мястэчка на самай мяжы з Украінай вызначаецца патрыярхальнымі палескімі традыцыямі, тут захавалася шмат аўтэнтычных рэчаў ды абрадаў. А цяпер вось да мясцовых славутасцяў дабавілася памежная застава, амаль усіх падарожнікаў нязменна сустракае ўзброены памежны нарад. І менавіта ў гэтым старадаўнім Дзівіне тутэйшыя майстрыхі шыюць прыгожыя рэчы, якія радуюць людзей па ўсім свеце.

Пачатак вытворчасці

А пачыналася біяграфія замежнага прадпрыемства «Лангхайнрых Канфекцыён Бел» з прыезду патэнцыйнага інвестара. Спадара Буркхарда Оеля абласныя кіраўнікі нібы ў сваты ў Дзівін вазілі. Закрыўся былы камбінат надомнай працы прадпрыемства «Брэстмесцпрам». Жанчыны з трохтысячнага населенага пункта пры любой нагодзе скардзіліся на адсутнасць работы. Памяшканне плошчай больш за 1200 квадратных метраў разбуралася. Айчынныя інвестары не спяшаліся прэзентаваць свае бізнес-праекты ў населеным пункце амаль за сотню кіламетраў ад Брэста. Так што прыезд нямецкага тэкстыльшчыка з горада Шлітца быў тут вельмі дарэчы.

Паступова, хоць і не без цяжкасцяў, урэгулявалі дакументальна-арганізацыйныя пытанні і прыступілі да рамонту і рэканструкцыі будынка. Потым прыйшоў час набіраць работнікаў. Мясцовы сельвыканкам падрыхтаваў спісы швачак. Усе яны атрымалі запрашэнні прыйсці на гутарку. Успамінае майстар Галіна Брышталь:

— Падборам людзей займалася менеджар з Германіі Сімона Шольц. Фрау Шольц падрабязна распытвала кожную з нас пра ранейшую работу, сям'ю, задавала пытанні, як нам здавалася, нават не па тэме. Яна рабіла нейкія паметкі ў сшытачку насупраць кожнага прозвішча. Потым былі прафесійныя іспыты, мы паказвалі, на што здатныя за швейнай машынкай. У выніку запрашэнне атрымалі не ўсе. Першая брыгада працаўніц прыступіла да работы летам 2006 года. І першую партыю абрусаў з нямецкай якасцю, зробленых у Дзівіне, адправілі заказчыку восенню гэтага ж года.

Яшчэ два гады Фрау Шольц жыла ў Кобрыне, кожны дзень прыязджала на працу ў Дзівін. Менавіта яна навучыла мясцовых работніц многім нюансам майстэрства, напрыклад еўрапейскаму крою. Гэта асаблівы від крою, які выконваецца ўручную «па нітцы», работа патрабуе дакладнасці, увагі, умення. Але менавіта такі крой забяспечвае форму вырабу на ўвесь час яго эксплуатацыі.

Галіна Уладзіміраўна нагадвае, што кожная з гаспадынь сутыкалася з праблемай, калі, напрыклад, навалочка пасля мыцця выглядае «крывой», яе нельга роўна згарнуць. Гэта значыць, што яна была няправільна скроеная. А крой, зроблены па нітцы тканіны, наадварот, пасля мыцця альбо прасавання выпраўляе выраб, робіць яго ідэальным.

Дырэктар Валянціна ПАШКЕВІЧ.

Асаблівасці работы

Пра апошнія ў цэху раскажуць не толькі майстар, але і любая работніца. Яны ведаюць, што кожны шывок павінен адпавядаць нарматывам, любая строчка павінна выглядаць ідэальна, кожны ражок надзейна замацаваны. Бо бялізна ў атэлях, рэстаранах, на круізных ды паветраных лайнерах выкарыстоўваецца інтэнсіўна, яе часта мыюць. Таму яна мусіць быць правільна выраблена.

Галоўны інжынер прадпрыемства Людміла Карпеш расказвае пра асаблівасці вытворчасці. Уся тканіна для пашыву паступае з Германіі, туды ж адпраўляецца гатовая прадукцыя паводле заказаў. Фірма працуе ў зоне мытнага кантролю. Гэта значыць, колькі тканіны прывезлі — улічваецца яе метраж, вага, — столькі ж павінна быць вывезена. Калі скажам, кліент заказаў круглы абрус, а такая форма, як і іншыя, выразаецца з прамавугольнай тканіны, то ўсе да аднаго абрэзкі трэба старанна ўпакаваць і адправіць разам з гатовым таварам, каб колькасць адпавядала прывезенаму ледзь не да грама. А штогадовая абавязковая інвентарызацыя азначае спыненне работы на тры дні, бо трэба пералічыць і зверыць кожную запчастку, нават ніткі, іголкі з машын. Такія асаблівасці работы названага прадпрыемства, да якіх у Дзівіне ўжо прызвычаіліся.

Сваю работу тут любяць. Інакш было б надзвычай складана дабіцца еўрапейскай якасці прадукцыі. А якасць і майстэрства дзівінчанак ужо ацанілі ва ўсім свеце. Абрусы, сурвэткі, пасцельныя камплекты выкарыстоўваюць у Арабскіх Эміратах, на Кіпры, ва ўсёй Еўропе. Мясцовыя швачкі не без гонару расказвалі, як выконвалі заказ для рэзідэнцыі караля Іарданіі. Шылі шторы, абрусы, пасцельную бялізну ў адным стылі. На кожны выраб наносілася каралеўская эмблема, кожная рэч акантоўвалася адмысловым чырвоным шліцам. Расказвалі, як потым старанна ўпакоўвалі гэты заказ, як спецыяліст па мытным афармленні Святлана Карнялюк нейкім чынам угаварыла пільнага мытніка не распакоўваць абрус. У адваротным выпадку любая выпадковая складачка магла б сапсаваць агульны бездакорны выгляд. І службоўцы ўвайшлі ў становішча, згадзіліся.

Швачка Таццяна ГАПАНОВІЧ і слесар-рамонтнік Аляксей ПАШКОВІЧ на рабочым месцы.

Раскройшчык Святлана КАЦЯЛЮК з дапамогай пнеўманажа адразае кавалак палатна.

Раскройшчыкі (злева направа) Валянціна БАРАНЧУК, Святлана КУЦЭВІЧ, Ліля ШЫДЛОВІЧ, Святлана БАРАНЧУК за працай.

Укладчыкі-ўпакоўшчыкі (злева направа) Валянціна СМІХОВІЧ, Вера КЛАЧКОВІЧ, Валянціна СЕРГЯЕВІЧ, Ірына ЛІТВІНЧУК.

Спецыяліст па мытным афармленні Святлана КАРНЯЛЮК правярае суправаджальную дакументацыю.

Юбілейны агляд

З асаблівай адказнасцю ставяцца на прадпрыемстве да выканання любога заказу. Аплата працы — здзельна-прэміяльная — таксама становіцца стымулам да самаўдасканалення кожнага з работнікаў. А іх у калектыве зараз 108, 10 жанчын знаходзяцца ў дэкрэтным водпуску. І як жа было прыемна, калі на 10-годдзе прадпрыемства прыехалі нямецкія заснавальнікі ды шчыра дзякавалі ўсім за працу. Тут захоўваюць нават прывітальныя адрасы, пісьмы падзякі з тых урачыстасцяў, і што асабліва цэняць: добрае слова гаварылася ў адрас кожнага з работнікаў, адмысловы падарунак быў уручаны ўсім. На свята запрасілі і ветэранаў калектыву, якія зараз на заслужаным адпачынку.

Дарэчы, і без юбілейных дат тут не забываюцца пра тых людзей, якія стаялі каля вытокаў новай швейнай фірмы. Гэтай восенню дырэктар прадпрыемства Валянціна Пашкевіч разам з галоўным інжынерам Людмілай Карпеш аб'ехалі ўсіх ветэранаў вытворчасці. Каго знайшлі на агародзе, каго ў дзяцей, але павіншавалі кожную з днём пажылых людзей, падарылі сувеніры і, галоўнае, пагаварылі, пацікавіліся справамі, запрасілі заходзіць у госці. І яны, бывае, заходзяць, не забываюць сваё прадпрыемства. Значыць, правільна сказаў на юбілеі Бернхард Оель, што для здзяйснення нечага значнага павінны сабрацца людзі, аб'яднаныя адной мэтай, людзі-аднадумцы.

Формула кіраўніка

А пра дырэктара ён сказаў так: «Валянціна Рыгораўна, як ніхто, здолела ўнікнуць у сутнасць нашага падыходу да арганізацыі працы і кіравання прадпрыемствам. Яе прафесіяналізм і глыбокія веды сталі асновай далейшага паспяховага развіцця вытворчасці. Яна валодае выдатнай здольнасцю адстойваць інтарэсы сваіх людзей, пры гэтым захоўвае інтарэсы нямецкага боку і такім чынам дзейнічае на карысць «Лангхайнрыха» ў цэлым».

Валянціна Пашкевіч прыйшла на толькі што зарэгістраванае прадпрыемства вопытным спецыялістам. Да гэтага яна два дзясяткі гадоў працавала галоўным бухгалтарам у розных галінах вытворчасці. Дырэктарам тады паставілі чалавека, які знаходзіўся ў Мінску. Вядома, усе аператыўныя пытанні даводзілася вырашаць на месцы галоўбуху. Таму праз год заснавальнік прапанаваў ёй узначаліць прадпрыемства. І не памыліўся. Бо, як ён сам канстатаваў на юбілеі фабрыкі, Валянціна Пашкевіч здолела выбудаваць такую сістэму функцыянавання вытворчасці, у аснове якой знаходзяцца адказнасць работніка і ўважлівае стаўленне з боку кіраўніка.

Пра названую формулу Валянціны Рыгораўны давялося пачуць ад многіх работнікаў з Дзівіна: ад спецыялістаў, майстра вытворчасці, радавых швачак і раскройшчыц. На змене ў гэты дзень (13 снежня. — **Аўт.**) працавалі раскройшчыцы Святлана Баранчук і Валянціна Баранчук, цёзкі па прозвішчы. Гісторыя гэтых работніц у многім паказальная для Дзівіна. Гэта іх першае рабочае месца. Прыкладна ў адзін час павыходзілі замуж, нарадзілі дзяцей, падгадавалі іх, а работу не маглі знайсці, не было асаблівага выбару ў іх вялікай вёсцы. Таму з радасцю прыйшлі, калі быў аб'яўлены набор швачак. На «Лангхайнрых» з першага дня, асвоілі ўсе аперацыі, цяпер паспяхова займаюцца раскроем. Святлана і Валянціна паказалі аўтару гэтых радкоў, як вядзецца знакаміты раскрой «па нітцы». Трэба спачатку выцягнуць нітку, паглядзець, як пабудаваная тканіна, і вызначыць кірунак надрэзу.

Працоўныя будні

А яшчэ тут могуць расказаць, што за ўсе гады дзейнасці прадпрыемства работнікі ніводнага дня не былі ў водпуску за свой кошт, што зарплата выплачваецца заўсёды своечасова і для сельскай мясцовасці вельмі нават неблагая. Так, у мінулым месяцы сярэдні паказчык па прадпрыемстве склаў 840 рублёў. Большасць работніц жывуць у самім Дзівіне. А жыхарак суседняга пасёлка Арэхаўскі і вёскі Воса на работу падвозіць мікрааўтобус, які арандуе прадпрыемства. Першая змена пачынаецца ў сем гадзін раніцы. На змену заступаюць два з паловай дзясяткі швачак, а таксама раскладчыцы, раскройшчыцы і іншыя спецыялісты. У бытавым пакоі яны надзяваюць форму, пакідаюць свае абеды ў халадзільніку, каб падчас абедзеннага перапынку іх разагрэць ды перакусіць. Для гэтага створаны ўсе ўмовы. У прасторным вытворчым цэху чыста, светла, тут падтрымліваюцца аптымальныя для працы ўмовы. Кожная работніца ведае свае абавязкі, яна прафесіянал у сваёй справе. Майстар раздае заданні на змену з улікам расцэнак работы. Гэта робіцца для таго, каб кожная з працаўніц магла зарабіць не меней за іншых.

Паралельна вядзецца ўлік пашывачных аперацый. Ім займаецца намеснік генеральнага дырэктара Аляксандр Шляпін. Аляксандр Германавіч заўсёды на сувязі з нямецкім бокам. Яму перакладчык не патрабуецца, ён пачынаў менавіта перакладчыкам, на гэтай фірме працуе з першага дня.

Некаторыя, пэўна, думаюць, што для таго каб выраблаць сталовую і пасцельную бялізну, не патрабуецца асаблівага майстэрства, і вельмі памыляюцца. Спрабавалі ўладкавацца на работу былыя швачкі з прыватных фірмаў, якія шыюць адзенне. Але ў іх не атрымалася, яны не вытрымалі высокіх патрабаванняў. І хутка сыходзілі. Так што размовы пра каманду аднадумцаў-прафесіяналаў не высокія словы.

Аляксандр ГАПАСЮК, аператар ЭВМ, Святлана ЯЙЧУК, намеснік галоўнага бухгалтара, Вераніка СУБОТКА, бухгалтар, Вольга КОЧЫНА, менеджар па планаванні вытворчасці, Людміла КАРПЕШ, галоўны інжынер, Таццяна ВОЎЧЫК спецыяліст па кадрах.

Цвяток радзімы васілька

Варта сказаць, што не ўся прыгажосць, якую робяць нястомныя працаўніцы ў Дзівіне, прадаецца за мяжой. Цяпер прадпрыемства актыўна асвойвае беларускі рынак. Камплекты пасцельнай бялізны ад «Лангхайнрых», якія можна купіць у нас, выглядаюць стылёва і функцыянальна. **Галоўны тэхнолаг прадпрыемства Галіна АСТАПЧУК** нярэдка выступае як галоўны канструктар і галоўны дызайнер новай прадукцыі. Дызайнерскія прыёмы выкарыстоўваюцца, паводле яе слоў, у пашыве пасцельнай бялізны. Для падкоўдранікаў і навалочак нярэдка бяруцца розныя матэрыялы. Напрыклад, верх шыецца з прыгожага бліскучага жакарду. А ніз вырабу, той, што бліжэй да цела, — са стапрацэнтнай бавоўны. Ёсць на вытворчасці вышывальныя машыны. І па жаданні заказчыка на выраб могуць нанесці альбо вышыць на ім лагатып, арнамент, вензель. Апошнім часам нярэдка паступаюць заказы на сумкі, сурвэткі, арыгінальныя карабы для хлеба ў нацыянальным стылі. Галіна Уладзіміраўна паказвае сурвэткі з арыгінальнымі ўзорамі:

— Вось варыяцыі беларускай вышыванкі, цяпер папулярныя такія арнаменты. Ну і куды ж нам без нашага васілька! Арнамент з васільком упрыгожвае самыя розныя сталовыя камплекты, пакупнік гэта цэніць.

— Цяпер не праблема зрабіць любую вышыванку, — працягвае размову **галоўны інжынер Людміла КАРПЕШ.** — У Мінску ёсць фірма, якой мы заказваем праграмнае забеспячэнне. Напрыклад, адпраўляем эскіз вышыўкі, яны робяць праграму для вышывальнай машыны. Так паяўляецца той самы васілёк альбо сняжынка з беларускім каларытам, якую мы наносім на тканіну. Сярод нашых заказчыкаў — мінскія рэстараны, гатэлі. Цяпер сваё нацыянальнае асабліва ў трэндзе, нават вышыванка крыжыкам становіцца надзвычай папулярнай. Таму стараемся ісці ў нагу з часам. Перад купляй васьмігаловачнай вышывальнай машыны нашы работніцы стажываліся ў Германіі. Зараз у сваіх вырабах мы ўдала спалучаем нямецкую дакладнасць і вытанчанасць з айчынным каларытам.

Лінейка прадукцыі «Лангхайнрых Канфекцыён Бел» налічвае больш за 250 відаў вырабаў. Тут заўсёды арыентаваліся на спажыўца. Могуць вырабіць пад заказ хоць мільён аднолькавых абрусаў, а могуць і адзін. Як пажадае кліент. А ў гандлёвым цэнтры «Аліса» ў Кобрыне адкрыты павільён «Лангхайнрых». Тут прадаюцца самыя розныя абрусы, камплекты пасцельнай бялізны, дарожкі на абедзенны стол, сурвэткі. Можна набыць гэтую прадукцыю і ў сталіцы.

Тэхнолаг Галіна АСТАПЧУК дэманструе гатовую прадукцыю.

Святлана ЯСКЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Андрэя САЗОНАВА. УНП 290433952.

Свята гульні і цацак

(Заканчэнне. Пачатак на 6-й стар.)

Для самых маленькіх сёлета былі абсталяваныя пляцоўкі з пясочніцамі і гульнявымі комплексамі. Тут і будаўнічыя інструменты, лялечныя домікі, наборы для юных гаспадынь, канструктары і іншыя цацкі. Рухавых і бясстрашных прыцягвалі гонкі на электрамабілях, дзіцячых веласіпедах, каталках вытворчасці СТАА «ПП Палессе». Кожны год праграма свята мае свае адметнасці. Гэтым разам аматары танкавых баталій змаглі пагрузіцца ў камп'ютарную гульню.

Было нямала сямейных забаў і спаборніцтваў. Напрыклад, сямейная квэст-эстафета «Школа супер-агентаў» прайшла ў форме рухавых гульняў і інтэлектуальных заданняў. Былі і водныя атракцыёны, і канцэрты. Кобрын стаў горадам дзяцей. Нездарма ж свята ўганаравалі сваёй прысутнасцю дыпламаты, парламентарыі, госці з іншых рэгіёнаў краіны і замежжа. А сёлета ў жніўні каля гандлёвага цэнтра «Палессе» праходзіў абласны школьны кірмаш, мерапрыемства наведаў старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч.

Згаданы ўніверсальны гандлёвы цэнтр кампанія адкрыла ў райцэнтры чатыры гады таму. Яго ацанілі не толькі гараджане, але і жыхары раёна, а таксама суседніх рэгіёнаў. Прадуктовы аддзел працуе да 23 гадзін, гэта зручна для людзей, якія позна працуюць альбо вяртаюцца з паездак. Папулярнасцю карыстаецца аддзел дзіцячых тавараў, у тым ліку цацкі. Пакупнікі з Польшчы, Расіі нярэдка хочуць купіць тавар там, дзе ён выпускаецца, і наведваюць гандлёвы цэнтр.

Цяпер нават цяжка сабе ўявіць Кобрын без «Палесся». А яшчэ дваццаць гадоў таму зусім нічога гэтага не было. Менавіта ў 1998 годзе браты Пётр і Уладзімір Ківакі і іх таварыш Андрэй Гольцман узялі ў арэнду невялікі цэх, завезлі некалькі станкоў і сталі адліваць пластмасавыя формы. Цяпер ў фае галоўнага корпуса стаіць той першы станок як рарытэт. Паціху развіваліся, нарошчвалі вытворчасць. І цяпер прадпрыемства пастаўляе сваю прадукцыю ў 66 краін свету. Асноўны рынак — гэта краіны СНД: Беларусь, Расія, Украіна, Казахстан.

— Сёння заставацца нязменным іграком на рынку не вельмі проста, даводзіцца прыкладаць шмат намаганняў, — расказвае **намеснік дырэктара кампаніі Уладзімір КІВАКА.** — Удзельнічаем у самых розных выстаўках, кірмашах. Пакупніка мы прывыклі прыцягваць якасцю і экалагічнасцю сваіх вырабаў.

Камплектоўшчыца цацак Вольга ЯРАМЧУК.


У адным з вытворчых памяшканняў прадпрыемства.

«Палессе» — самае вялікае ў Кобрыне прадпрыемства, тут працуе тры тысячы чалавек. Вытворчыя плошчы займаюць 65 тысяч квадратных метраў. Гэта былыя пустуючыя памяшканні прадзільнай фабрыкі «Ручайка». Іх паступова выкупілі, прывялі ў парадак, аснасцілі адпаведна. Асноўная вытворчасць размяшчаецца ў Кобрыне, а некалькі гадоў таму адкрылі філіял у Пінску, там занята больш за 400 чалавек.

На «Палессі» ганарацца тым, што працаўнікі атрымліваюць годную зарплату, маюць прыстойны сацпакет. Цяпер яшчэ кожны работнік у сваім гандлёвым цэнтры можа набыць у лік зарплаты любыя тавары ад прадуктаў харчавання да будаўнічых матэрыялаў. Тут умеюць цікава адпачываць. Нават на стэндах у калідоры галоўнага корпуса можна ўбачыць маляўнічыя ілюстрацыі з разнастайных спартакіяд, канцэртаў, свят.

А сёлета група спецыялістаў фабрыкі цацак сабрала з канструктара аўтамабіль Geely Atlas у натуральную велічыню. На ўнікальную цацку пайшло 145 тысяч дэталяў. Гэты аўтамабіль важыць 1756 кілаграмаў, больш за арыгінал. Творчая група — пяць дзяўчат і хлопец — патрацілі на зборку 160 гадзін. І цяпер цацачны цуд тэхнікі курсіруе па салонах аднайменнага аўтамабіля і карыстаецца папулярнасцю.

Святлана ЯСКЕВІЧ.